ГАЗЕТА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

# Гомельскі універсітэт



№ 3 (941) | АЎТОРАК, 10 лютага 1998 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года | Выходзіць два разы ў месяц | Цана дагаворная

## СВЯТА НАВУКОЎЦАЎ

Як вядома, на апошнюю нядзелю першага месяца года прыпадае Дзень беларускай навукі. Аднак дыяпазон яго святкавання значна шырэйшы. Так, сёлета яго адзначылі спачатку 23-га студзеня ў вялікай канферэнц-зале Нацыянальнай акадэміі навук на яе спецыяльнай сесіі, у рабоце якой прымаў удзел і рэктар нашага універсітэта член-карэспандэнт НАН Беларусі Л.А.Шамяткоў.

На сесіі выступіў намеснік прэм'ер-міністра У.П.Заматалін. Ён зачытаў прывітальнае пісьмо вучоным ад Прэзідэнта краіны, дзе сканцэнтраваўся ўвесь сэнс узаемаадносін навукі і дзяржавы.

Ва ўрачыстай абстаноўцы на сесіі былі ўручаны шматлікія прэміі.

Навукоўцы нашага горада і вобласці сваё прафесіянальнае свята адзначалі 30-га студзеня ў абласным драмтэатры. Тут было зроблена ўсё для таго, каб яно прайшло на высокім узроўні і запамінальна. Выстаўленыя для агляду апублікаваныя навуковыя працы і перыядычныя выданні, мелодыі сімфанічнага аркестра, цёплыя прывітальныя словы вядучых напоўнілі атмасферу своеасаблівым прыўзнятым настроем.

На сцэну былі выкліканы і прадстаўлены публіцы рэктары ўсіх шасці ВНУ і дырэктары некаторых вядучых навукова-даследчых інстытутаў і арганізацый Гомельшчыны.

З кароткім, але даволі змястоўным дакладам выступіў член Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу, дырэктар Інстытута лесу Нацыянальнай акадэміі навук акадэмік В.А. Іпацьеў. Ён ахарактарызаваў дасягненні навукоўцаў Гомельшчыны за апошні час, гаварыў аб іх задачах і праблемах. Прамоўца выказаў цёплыя словы ў адрас нашага універсітэта.

Удзельнікаў урачыстай вечарыны цёпла павіншаваў са святам і пажадаў новых поспехаў у вельмі важнай працы старшыня Гомельскага аблвыканкома М.Р.Вайцянкоў. Ён павіншаваў таксама з узнагародай і ўручыў Ганаровыя граматы Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь рэктару Беларускага дзяржаўнага універсітэта транспарту В.П.Ярашэвічу і дэкану факультэта фізічнай культуры нашага універсітэта Б.М.Зайцаву, якімі яны ўзнагароджаны за шматгадовую добрасумленную работу, актыўны ўдзел у грамадскім жыцці і ў сувязі з 60-годдзем утварэння Гомельскай вобласці. Групе вучоных былі ўручаны Ганаровыя граматы Гомельскага аблвыканкома. Яе ўдастоена і загадчыца кафедры беларускай мовы ГДУ А.А.Станкевіч, якая нядаўна паспяхова абараніла дысертацыю на атрыманне навуковай ступені доктара філалагічных навук.

Святочная вечарына закончылася вялікім канцэртам, які адкрылі сваім выступленнем самадзейныя артысты нашага універсітэта. Асабліва шмат апладысментаў выпала на долю народнага фальклорна-этнаграфічнага ансамбля "Радзімічы" і старшай выкладчыцы кафедры нямецкай мовы Т.Р.Макушынскай.

У канцэрце прынялі ўдзел лепшыя выканаўцы розных калектываў іншых ВНУ г.Гомеля.

**Б.ВАЛОДЗІН.**

На Савеце універсітэта

## АБ ДАСЯГНЕННЯХ ЛЕТАШНІХ І ЗАДАЧАХ СЁЛЕТНІХ

29 студзеня ў актавай зале адбылося пашыранае пасяджэнне Савета універсітэта. На ім прысутнічалі звыш 200 выкладчыкаў і супрацоўнікаў. Пасяджэнне Савета было прымеркавана да Дня беларускай навукі. Ва ўрачыстай абстаноўцы рэктар Л.А.Шамяткоў уручыў дыпломы дацэнтаў кандыдатам навук С.П.Жогалю з кафедры матэматычных праблем кіравання і Л.С.Скрабінай з кафедры псіхалогіі.

Затым удзельнікі пасяджэння з вялікай увагай выслухалі даклад рэктара універсітэта члена-карэспандэнта НАН Беларусі прафесара Л.А.Шамяткова аб асноўных напрамках дзейнасці ГДУ ў 1997 годзе і задачах на 1998 год. Садаклады: аб выніках вучэбна-метадычнай работы ў 1997 годзе і задачах на 1998 год; выніках навукова-даследчай работы і падрыхтоўкі навукова-педагагічных кадраў у 1997 годзе і задачах на 1998 год

(ЗАКАНЧЭННЕ НА 2-й СТР.)

## ІМЯННЫЯ СТЫПЕНДЫЯТЫ

За выдатную вучобу на падставе рашэння Савета універсітэта ад 29 студзеня 1998 г. па выніках зімовай экзамецыйнай сесіі назначаны імянныя стыпендыі на другі семестр бягучага навучальнага года:

***з 1 студзеня***
**імя Ф.СКАРЫНЫ**

**НІКІЦЮКУ Юрыю** -- студэнту V курса фізічнага факультэта;

стыпендыя Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь назначана **БУЛАВІК Марыне** --студэнтцы V курса эканамічнага факультэта;

***з 1 лютага***
**імя П.БРОЎКІ**

**АФОНЧАНКА Тацціяне** -- студэнтцы IV курса гісторыка-юрыдычнага факультэта;

**імя Ф.СКАРЫНЫ**

**ШПЫРКО Вользе** -- студэнтцы V курса матэматычнага факультэта;

**ШЧАРБАКОВУ Івану** -- студэнту III курса эканамічнага факультэта;

**імя К.КРАПІВЫ**

**ЛУКШУ Віталю** -- студэнту V курса геолага-геаграфічнага факультэта;

**імя Я.КОЛАСА**

**НАРСКІНУ Аляксею** -- студэнту IV курса факультэта фізічнай культуры.

## ВІНШУЕМ!

*Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, дэканат, выкладчыкі, супрацоўнікі і студэнты матэматычнага факультэта горача віншуюць асістэнтку кафедры вылічальнай матэматыкі і праграміравання **РУЖЫЦКУЮ Алену Адольфаўну**, якая першая ў гэтым годзе паспяхова абараніла дысертацыю на атрыманне вучонай ступені кандыдата фізіка-матэматычных навук.*

## АБ ДАСЯГНЕННЯХ ЛЕТАШНІХ І ЗАДАЧАХ СЁЛЕТНІХ

**На Савеце універсітэта**

**(ЗАКАНЧЭННЕ. ПАЧАТАК НА 1-й СТР.)**

зрабілі адпаведна першы прарэктар, прафесар М.В. Селькін і прарэктар па навуковай рабоце, прафесар Д.Р.Лін.

З нагоды Дня беларускай навукі былі ўручаны Ганаровыя граматы перспектыўных матэрыялаў; за далучэнне школьнай моладзі да навукова-даследчай работы -- геолага-геаграфічнаму факультэту; за высокі ўзровень навукова-даследчай работы студэнтаў -- біялагічнаму, матэматычнаму і фізічнаму факультэтам.



*На Савеце выступае рэктар Л.А.Шамяткоў.*
*Фота У.Чысціка.*

універсітэта: за высокія паказчыкі ў выдавецкай дзейнасці па выніках навукова-даследчай работы 1997 года -- кафедрам агульнай фізікі, беларускай мовы, заалогіі і аховы прыроды, алгебры і геаметрыі; за актыўную работу па падрыхтоўцы кадраў вышэйшай кваліфікацыі -- кафедры алгебры і геаметрыі; за работу па ўкараненню вынікаў навуковых даследаванняў у вытворчасць -- праблемнай навукова-даследчай лабараторыі

Аб выніках фінансавай дзейнасці універсітэта ў 1997 годзе праінфармавала галоўны бухгалтар І.А.Курава. Яна адзначыла, што універсітэцкае фінансавае становішча летась было значна лепшым, чым у папярэднія два гады.

Аб выкананні рашэнняў Савета універсітэта па пытаннях вучэбна-метадычнай і выхаваўчай работы, прынятых у папярэднім навучальным годзе, прысутных на пасяджэнні праінфармаваў прарэктар па вучэбнай і выхаваўчай рабоце М.М.Воінаў.

Па інфармацыі начальніка НДС В.Р.Сафонава размеркаваны сродкі, выдзеленыя з бюджэту рэспублікі на фінансаванне фундаментальных даследаванняў у 1998 годзе, устаноўлены працэнт адлічэнняў на сацыяльныя патрэбы ад сродкаў, выдзеленых з рэспубліканскага бюджэту на выкананне фундаментальных і пошукавых даследаванняў.

Разгледжаны кадравыя пытанні. Доктары навук прафесары В.В. Мажароўскі і Ю.С.Ушакоў абраны адпаведна загадчыкамі кафедры вылічальнай матэматыкі і праграміравання і кафедры радыёфізікі. Кандыдат эканамічных навук дацэнт У.П.Бабына абраны на новы тэрмін загадчыкам кафедры бухуліку, кантролю і аналізу гаспадарчай дзейнасці. Кандыдаты навук В.І.Яцухна з кафедры беларускай літаратуры, Л.В.Фядосенка -- з кафедры эканомікі і кіравання вытворчасцю, Я.А.Дэй -- з кафедры тэарэтычнай фізікі рэкамендаваны БелВАКу на прысваенне вучонага звання дацэнт.

**З УЗНАГАРОДАЙ!**

*За шматгадовую навуковую і вучэбную работу па падрыхтоўцы маладых спецыялістаў, актыўны ўдзел у грамадскім жыцці і ў сувязі з 60-годдзем з дня нараджэння старшы выкладчык кафедры агульнай фізікі БАРАНАЎ МіхаілЦіханавіч узнагароджаны Ганаровай граматай універсітэта.*

## КВАЛІФІКАЦЫЮ ПАВЫШАЮЦЬ МАЛАДЫЯ ВЫКЛАДЧЫКІ

З канца студзеня ў нашым універсітэце пачаў працаваць семінар па павышэнню кваліфікацыі маладых выкладчыкаў. Праграма разлічана на 50 гадзін. 10 з іх прадугледжаны на пленарныя лекцыі, астатнія адводзяцца для работы на факультэтах.

Тэматычным планам неабходна павысіць кваліфікацыю больш чым 120 маладым спецыялістам. Гэта задача ўскладзена на кафедру педагогікі.

Першая пленарная лекцыя "Псіхалогія зносін" была прачытана на семінары кандыдатам педагагічных навук, дацэнтам кафедры акмеалогіі Гомельскага абласнога інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў адукацыі Г.В.Гатальскай.

На наступных занятках праблемам культуры педагагічных зносін сваю лекцыю прысвяціў загадчык кафедры педагогікі ГДУ, доктар педагагічных навук, прафесар, акадэмік Нацыянальнай акадэміі навук Рэспублікі Беларусь І.Ф.Харламаў.

У красавіку г.г. для маладых выкладчыкаў адбудзецца канферэнцыя "Актуальныя праблемы навукова-метадычнай работы", матэрыялы якой будуць выдадзены ў дзвюх кнігах.

**Б.ВАЛОДЗІН.**

## СУСТРЭЧА З ІНФАРМАЦЫЙНАЙ ГРУПАЙ ГАРВЫКАНКОМА

У ідэалагічнай рабоце важнае месца цяпер, як і ў ранейшыя гады, адводзіцца дзейнасці інфармацыйных груп. Створана яна і пры Гомельскім гарвыканкоме. 3-га лютага яе члены наведалі наш універсітэт.

Сустрэча адбылася ў аўд. 2-26 вучэбнага корпуса N5. Яе адкрыў прарэктар па вучэбнай і выхаваўчай рабоце М.М.Воінаў, які прадставіў прысутным членаў інфармацыйнай групы.

Выступіў кіраўнік групы намеснік старшыні гарвыканкома, выпускнік нашага універсітэта В.В.Зашчук. Валерый Валер'евіч расказаў пра сённяшні стан нашага горада, аб выніках дзейнасці за 1997 год, прагнозах на сёлета і перспектывах.

Сярод удзельнікаў інфармацыйнай групы былі прадстаўнікі жыллёва-камунальнай гаспадаркі, аддзелаў аховы здароўя і адукацыі, органаў унутраных спраў і іншых вядучых служб гарвыканкома. Яны далі вычарпальныя адказы на ўсе зададзеныя пытанні.

## ОРДЭН "ДРУЖБЫ" -- ВУЧОНАМУ

Дырэктар Гомельскага канструктарскага бюро "Прамень", доктар тэхнічных навук, прафесар Ю.С.Ушакоў па сумяшчальніцтву загадвае кафедрай радыёфізікі нашага універсітэта. Нядаўна ў яго жыцці адбылася знамянальная падзея. Ён і яго 5 калег па ГКБ і Гомельскаму радыёзаводу, якія займаюцца распрацоўкай, канструяваннем і вырабам антэнна-фідзерных прыстасаванняў, удастоены расійскіх ордэнаў "Дружба". Высокія ўзнагароды гамяльчанам былі ўручаны ў Мінску ў Доме дружбы паслом Расіі ў Беларусі Валерыем Лашчыніным у прысутнасці міністра замежных спраў нашай рэспублікі І.І.Антановіча, міністра прамысловасці А.Д.Харлапа і іншых афіцыйных асоб.



*Імі ганарыцца універсітэт*

## УМЕЦЬ ВУЧЫЦЦА

Універсітэт -- не школа... Тут не выклікаюць кожны дзень адказваць па зададзенай тэме, няма і абавязковых дамашніх заданняў. Сістэма навучання ў ВНУ дае студэнту магчымасць больш займацца самастойна: у бібліятэцы, чытальнай зале па рэкамендаванай літаратуры, перыядычных выданнях. Аднак многія сённяшнія студэнты яшчэ не могуць пераадолець у сабе школьны стэрэатып -- калі зададуць выкладчыкі нешта вывучыць, зробяць гэта, а калі не -- так і не адкрыюць канспект ці падручнік аж да практычных заняткаў ці нават да самой сесіі. Адным словам, ім яшчэ трэба навучыцца правільна вучыцца.



***На здымку:*** скарынаўскі стыпендыят Іван Шчарбакоў.
**Фота У.ЧЫСЦІКА.**

У Івана Шчарбакова ўсё інакш. Ён з першага курса добра зразумеў, што самастойнасць, адказнасць -- надзейныя памочнікі ў вучобе. У яго гэта засталося яшчэ са школы. Заканамерна закончыў СШ N8 г.Гомеля з залатым медалём. Асабістая зацікаўленасць, жаданне самому "дакапацца" да ісціны, спазнаць больш таго, чым прадугледжана праграмай, нібы той вечны рухавік вялі яго да выдатных адзнак, да глыбокіх ведаў. Шчарбакоў быў неаднаразовым удзельнікам раённых, абласных і рэспубліканскіх алімпіяд па матэматыцы, на якіх займаў першыя месцы. І цяпер толькі на "выдатна" вучыцца стыпендыят імя Ф.Скарыны трэцякурснік спецыяльнасці "Бухгалтарскі ўлік, аналіз і аўдыт" Іван Шчарбакоў.

У будучага эканаміста хапае часу і на вучобу, і на навукова-даследчую работу. Яго навуковыя даклады аб падаткавай сістэме Рэспублікі Беларусь, аб праблемах прыцягнення інвестыцый у нашу краіну адзначаліся ў ліку лепшых на рэспубліканскіх студэнцкіх навукова-практычных канферэнцыях, якія праводзіліся ў Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь і ў Белдзяржуніверсітэце. Ёсць у юнака жылка даследчыка, які без пэўнага нажыму выкладчыкаў шукае сваё слова ў эканамічнай навуцы.

-- Трэба працаваць самому сістэматычна, -- гаворыць І.Шчарбакоў. -- Толькі тых ведаў, якія мы атрымліваем ва універсітэце, не зусім дастаткова, каб быць запатрабаваным пасля атрымання дыплома на рынку працы ў сённяшніх умовах.

А добрую разрадку пасля вучобы Івану дае спорт: ён вельмі любіць плаванне, яшчэ са школы захапляецца пяцібор'ем. І наогул, бачыш у гэтым юнаку асобу неардынарную: захопленую, мэтанакіраваную. А такія ў жыцці могуць дасягнуць многага.

**Т.НІКАЛАЕВА.**

*Аб новых памерах стыпендый*

## КОЖНАМУ -- ПА ВЕДАХ

Ёсць вядомы студэнцкі жарт: "Стыпендыя -- гэта аплата за страх у час экзаменаў". А як вядома, у кожным жарце -- доля праўды. Але жарты жартамі, а калі гаварыць сур'ёзна, то без дзяржаўнай штомесячнай грашовай падтрымкі, якую можна заслужыць толькі дзякуючы стараннасці ў вучобе, складана даводзіцца студэнту. А калі яшчэ і на бацькоўскую дапамогу нельга разлічваць, цяжэй можа быць удвая. Так што выбіраць студэнту трэба адно -- добра вучыцца.

На падставе пастановы Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 30 снежня 1997 г. у вышэйшых навучальных установах з 1 студзеня бягучага года памеры дзяржаўных стыпендый устанаўліваюцца ў наступных памерах: імянная стыпендыя складае 975000 руб; **для студэнтаў гуманітарных, эканамічных, педагагічных спецыяльнасцей** вучэбная стыпендыя па выніках сесіі ў балах ад 3.6 да 4,0 раўняецца 500000 руб.; ад 4,0 да 4,5 -- 550000 руб.; ад 4,5 да 5,0 -- 650000 руб. Студэнтам, якія атрымалі 5 балаў, назначаецца стыпендыя ў памеры 750000 руб.

Студэнтам **прыродазнаўча-навуковых і тэхнічных спецыяльнасцей,** якія атрымалі на сесіі ад 3,4 да 4,0 балаў, прызначаецца стыпендыя ў памеры 500000 руб.; ад 4,0 да 4,5 -- 600000 руб.; ад 4,5 да 5,0 -- 700000 руб.; 5,0 -- 800000 руб.

Памер сацыяльнай стыпендыі для студэнтаў усіх спецыяльнасцей складае 400000 руб., персанальная стыпендыя Савета ВНУ -- 650000 руб.

Слухачы падрыхтоўчага аддзялення з ліку дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў і знаходзяцца на поўным дзяржаўным забеспячэнні, будуць атрымліваць 312500 руб.

Маюць права прэтэндаваць на атрыманне сацыяльнай стыпендыі два разы за ўвесь час навучання ва універсітэце тыя студэнты, якія прыехалі на вучобу ў ГДУ з чыстых ад радыяцыі зон і па выніках сесіі не заслужылі вучэбнай стыпендыі. Для гэтага ім неабходна напісаць асабістую заяву ў дэканат факультэта.

## Наш афіцыйны аддзел



*Ў апошні час пры разглядзе пытання аб прысваенні вучонага звання або пры абранні на вакантныя пасады многія выкладчыкі няправільна афармляюць спіс апублікаваных работ. Ён павінен афармляцца ў адпаведнасці з формай 1, якая прыводзіцца ў дакуменце "Парадак прысваення вучоных званняў прафесара і дацэнта Рэспублікі Беларусь":*

# ЯК ПРАВІЛЬНА АФОРМІЦЬ СПІС АПУБЛІКАВАНЫХ РАБОТ

| N пп | Назва | Від работы | Выхадныя дадзеныя | Аб'ём (у стар.) | Сааўтары (не больш 5) |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |

**Спіс мае раздзелы:**
1. Вучэбна-метадычныя работы
   1.1. да абароны дысертацыі
   1.2. пасля абароны дысертацыі
2. Навуковыя работы
   2.1. да абароны дысертацыі
   2.2. пасля абароны дысертацыі
3. Аўтарскія работы

У канцы спіса даюцца подпісы (з указаннем ініцыялаў і прозвішчаў) загадчыка кафедры і Вучонага сакратара).

Саіскальнік
Загадчык кафедры
Вучоны сакратар савета

Пасля подпісаў ставіцца ў падрабязным запісе дата падпісання.

У калонцы 2 (назва) прыводзіцца поўная назва работы на мове арыгінала. Найбольшую колькасць заўваг прыходзіцца звычайна на калонку 3 (від работы). Перш за ўсё фігурыравала адно з двух слоў: "друкаваная" або "рукапісная". Цяпер жа ў адпаведнасці з прынятымі стандартамі ў калонцы (3) указваюцца наступныя віды публікацый: артыкул, падручнік, вучэбны дапаможнік, вучэбна-метадычны дапаможнік, дапаможнік, курс лекцый, практыкум, манаграфія, тэзісы (аб прынятых асноўных відах дапаможнікаў ніжэй будзе сказана больш падрабязна). Калі ёсць адпаведны грыф міністэрства (зацверджана, дапушчана, рэкамендавана), то ён абавязкова адзначаецца ў калонцы 2. У спіс апублікаваных работ можа ўключацца і рукапіс, але пры адной умове: ён павінен быць дэпаніраваны ў сістэме навукова-тэхнічнай інфармацыі і анатацыя або рэферат на гэты рукапіс павінны быць змешчаны ў навуковым часопісе або ў адным з навукова-інфармацыйных выданняў. Пры гэтым інфармацыя аб анатацыі або рэфераце прыводзіцца ў калонцы 4. Выхадныя дадзеныя апублікаваных работ у калонцы 4 прыводзяцца па аналогіі з цытаванай літаратурай у навуковых артыкулах. У 5-ай калонцы ўказваецца колькасць старонак у кнізе, артыкуле, дапаможніку і г.д., прычым, калі ёсць сааўтары, то ў лічніку дробу ўказваецца агульная колькасць старонак, а ў назоўніку -- доля старонак саіскальніка. Аб раздзеле 3 заўважым наступнае: да аўтарскіх работ адносяцца: аўтарскія пасведчанні, дыпломы, патэнты, ліцэнзіі, інфармацыйныя карты, алгарытмы, праекты, творчыя работы. Нумар адпаведнага аўтарскага дапаможніка або іншых аўтарскіх работ разам з іншымі выхаднымі дадзенымі прыводзіцца ў калонцы 4.

У спіс апублікаваных работ не ўключаюцца: матэрыялы, якія знаходзяцца ў друку, справаздачы аб навукова-даследчых работах, дысертацыі, газетныя артыкулы і іншыя публікацыі папулярнага характару, станоўчыя рашэнні на заяўкі аб выдачы дыпломаў, аўтарскіх пасведчанняў.

Прывядзем цяпер стандартныя вызначэнні некаторых відаў работ, назвы якіх прыводзяцца ў калонцы 2. 3

**Манаграфія** -- "навуковае кніжнае выданне, якое змяшчае звесткі пра ўсебаковае даследаванне адной праблемы або тэмы і належыць аднаму аўтару або калектыву аўтараў".

**Прэпрынт** -- так называецца "навуковае выданне, якое змяшчае матэрыялы папярэдняга характару, апублікаваныя да выхаду ў свет выдання, дзе іх мяркуецца выкарыстаць".

**Дапаможнік** -- гэта выданне, якое прызначана ў дапамогу практычнай дзейнасці ці авалоданню вучэбнай дысцыплінай.

Калі змест у дапаможніку перадаецца, у асноўным, з дапамогай відарысу (выявы), тады гэта будзе наглядны дапаможнік.

**Практычны дапаможнік** уяўляе сабой "вытворча-практычнае выданне, прызначанае практычным работнікам для авалодання ведамі (навыкамі) пры выкананні якой-небудзь работы (аперацыі, працэсу)".

"Вучэбнае выданне, якое вызначае змест, аб'ём, а таксама парадак вывучэння пэўнай дысцыпліны (яе раздзела, часткі), мае назву **"вучэбная праграма"**.

Тэрміну **"падручнік"** даецца наступнае азначэнне: "Вучэбнае выданне, якое змяшчае сістэматызаваны выклад вучэбнай дысцыпліны (яе раздзела, часткі)".

"Вучэбнае выданне, якое дапаўняе або часткова (ці поўнасцю) замяняе падручнік", мае назву **"вучэбны дапаможнік"**.

Пад тэрмінам **"вучэбны наглядны дапаможнік"** маецца на ўвазе вучэбнае тэкставае або выяўленчае выданне з матэрыяламі ў дапамогу вывучэнню, выкладанню ці выхаванню.

**Вучэбна-метадычны дапаможнік** -- "вучэбнае выданне, якое змяшчае матэрыялы па методыцы выкладання вучэбнай дысцыпліны (яе раздзела, часткі) ці па методыцы выхавання".

Вучэбнае выданне, у якім прыводзяцца практычныя заданні і практыкаванні, што спрыяюць разуменню і засваенню адукацыйнага матэрыялу, мае назву **"практыкум"**.

Пры прадстаўленні спіса апублікаваных работ на подпіс вучонаму сакратару адначасова неабходна прадстаўляць і самі работы або іх адбіткі.

**Л.ПАЛЯКОЎ,**
**дацэнт, вучоны сакратар Савета ГДУ.**



## *Новае ў аздараўленні і санаторна-курортным лячэнні*

# ЦІ БУДЗЕМ З ПУЦЁЎКАМІ?

Як вядома, з восені мінулага года размеркаваннем пуцёвак сталі займацца не прафсаюзы, а камісіі па лячэнню і аздараўленню, створаныя на прадпрыемствах, у арганізацыях, у навучальных установах у адпаведнасці з Палажэннем аб парадку накіравання на аздараўленне і санаторна-курортнае лячэнне насельніцтва за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту і сродкаў дзяржаўнага сацыяльнага страхавання. Палажэнне зацверджана Міністэрствам сацыяльнай абароны, Міністэрствам адукацыі, Міністэрствам па надзвычайных сітуацыях, Рэспубліканскім цэнтрам па аздараўленню і санаторна-курортнаму лячэнню насельніцтва.

Згодна вышэйназванага Палажэння ў нашым універсітэце створаны 2 камісіі па аздараўленню і санаторна-курортнаму лячэнню: для выкладчыкаў і супрацоўнікаў; для студэнтаў ГДУ. Іх склад зацверджаны на Савеце універсітэта. У састаў камісіі, якая займаецца аздараўленнем выкладчыкаў і супрацоўнікаў, увайшлі: **А.П.Кармазін**, -- прарэктар па кадрах і сацыяльна-бытавых пытаннях (старшыня камісіі), **Г.І.Варатніцкі** -- старшыня прафкома, **Т.А.Валчкова** -- бухгалтар прафкома, **М.В.Каняхін** -- загадчык кафедры лёгкай атлетыкі і лыжнага спорту, ліквідатар аварыі на ЧАЭС. У камісію, якая займаецца аздараўленнем студэнтаў, увайшлі: **А.П.Кармазін** --прарэктар па кадрах і сацыяльна-бытавых пытаннях (старшыня камісіі), **Н.І.Колтышава** -- старшыня прафкома студэнтаў, **Р.А.Банькоўскі** -- нам. старшыні прафкома студэнтаў, студэнт V курса гісторыка-юрыдычнага факультэта, **А.У.Гарбачоў** -- сакратар камітэта БПСМ ГДУ, студэнт V курса гісторыка-юрыдычнага факультэта.

Камісіі вядуць улік тых, хто мае патрэбу ў аздараўленні і санаторна-курортным лячэнні на падставе пісьмовых заяў работнікаў і студэнтаў і медыцынскага заключэння аб неабходнасці санаторна-курортнага лячэння. На падставе гэтага ўліку камісіі накіроўваюць гарадскому (раённаму) спецыялісту Рэспубліканскага цэнтра па аздараўленню і санаторна-курортнаму лячэнню насельніцтва заяўку на пуцёўкі, якія набываюцца за кошт сродкаў дзяржаўнага сацыяльнага страхавання, і асобна заяўку на пуцёўкі для асоб, што маюць ільготы ў адпаведнасці з Законам Рэспублікі Беларусь "Аб сацыяльнай абароне грамадзян, якія пацярпелі ад аварыі на ЧАЭС".

Выдача пуцёвак праводзіцца пасля прадстаўлення неабходных дакументаў (даведка аб заработнай плаце, квітанцыя аб аплаце частковага кошту, пасведчанне, якое пацвярджае льготы, устаноўленыя заканадаўствам).

Права на аздараўленне і санаторна-курортнае лячэнне за кошт сродкаў дзяржаўнага сацыяльнага страхавання маюць асобы, якія падлягаюць дзяржаўнаму сацыяльнаму страхаванню і плацяць у адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь страхавыя ўзносы ў Фонд сацыяльнай абароны насельніцтва, а таксама дзеці і вучнёўская моладзь (ПТВ,ВНУ).

Пуцёўкі для дарослага і дзіцяці, вучнёўскай моладзі і на аздараўленне дзяцей выдаюцца з аплатай 10-ці працэнтаў іх кошту.

Размер частковай аплаты за пуцёўку работнікам устанаўліваецца на падставе даведкі аб памеры заработнай платы (даходу), налічанай ім за каляндарны месяц, які папярэднічае месяцу, у якім выдаецца пуцёўка, з улікам прэмій, даплат, надбавак.

Асобна трэба сказаць аб новаўвядзеннях у аздараўленні маці з дзецьмі. Цяпер бясплатную пуцёўку могуць атрымаць толькі маці з дзецьмі ва ўзросце да сямі гадоў. Школьнікі (з 7 да 18 год) праходзяць аздараўленне без бацькоў у піянерскіх лагерах і дзіцячых санаторыях Беларусі. Маці з дзіцём ва ўзросце ад 7 да 14 гадоў можа атрымаць бясплатную пуцёўку на санаторнае лячэнне ў тым выпадку, калі ўрач выдасць дзіцяці даведку аб неабходнасці яго суправаджэння дарослым, а таксама калі дзіця з'яўляецца інвалідам, што пацвярджаецца даведкай УВК.

На бягучы год на аздараўленне і лячэнне насельніцтва Гомельскай вобласці выдзелена 1 трл. 500 млрд. руб., з іх 70 % -- на аздараўленне школьнікаў, якім будуць займацца органы народнай адукацыі. Каб атрымаць пуцёўку для дзіцяці, неабходна прадставіць у камісію даведку аб тым, што сёлета раней пуцёўкай яно яшчэ не карысталася (з месца працы аднаго з бацькоў, са школы і г.д.).

Ліквідатары аварыі на ЧАЭС (арт.18, арт.19), якія падавалі ў мінулым годзе ў камісію заявы на выдзяленне пуцёвак, але імі не карысталіся з-за іх адсутнасці або па іншай вельмі ўважлівай прычыне, маюць права атрымаць грашовую кампенсацыю: за санаторна-курортнае лячэнне -- 3 млн. 100 тыс.руб., за пуцёўку на базу адпачынку -- 2 млн. 300 тыс.руб. Для гэтага трэба прадставіць у камісію па аздараўленню заявы на выплаты кампенсацый да 1 сакавіка г.г.

**Т.ДУБЯК.**

ЖЖЖЖЖЖЖЖЖЖЖЖЖЖЖЖЖЖЖЖЖЖЖЖЖЖЖЖЖЖЖЖЖЖЖЖЖЖЖЖЖЖЖЖЖЖЖЖЖЖЖ

**Студэнцкія канікулы**

# АДПАЧЫНАК ПА МАГЧЫМАСЦЯХ

Няма больш жаданага і прыемнага часу для студэнтаў у навучальным годзе, чым канікулы. Ні табе лекцый, ні практычных заняткаў, канспекты і падручнікі прыбіраюцца надалей з вачэй, каб не нагадвалі аб вучобе. У гэты час можна поўнасцю расслабіцца: паспаць удосталь, любімую музыку паслухаць, паглядзець тэлевізар... Час перапынку паміж вучэбнымі семестрамі можна выкарыстаць і для ўмацавання і папраўкі здароўя ў дамах адпачынку, у санаторыях.

Што сёлета прапаноўвалася студэнтам ГДУ ў зімовыя канікулы? Уладальнікамі пуцёвак маглі, на жаль, стаць толькі першакурснікі, якім яшчэ не споўнілася 18 гадоў. Толькі некалькі чалавек старэйшага ўзросту змаглі паехаць у санаторыі. Абласной камісіяй па аздараўленню было выдзелена нашаму універсітэту 45 пуцёвак для названай катэгорыі студэнтаў на базу адпачынку "Пунсовыя ветразі" завода пускавых рухавікоў, 12 чалавек змаглі падмацаваць здароўе ў санаторыі "Буг", 5 -- у санаторыі "Прыдняпроўскі", 7 -- у санаторыі "Чонкі", 5 -- у санаторыі "Будаўнік", што на возеры Нарач.

Такім чынам, магчымасці аздараўлення ў студэнтаў старэйшых курсаў, у параўнанні з іх малодшымі калегамі, даволі сціплыя. Таму ім нічога не застаецца, як сядзець у час канікулаў дома.

# І КАРЫСНА, І ВЫГАДНА

Не сакрэт, што папулярнасць санаторыя-прафілакторыя ГДУ ў апошні час узрасла. Жадаючых атрымаць сюды пуцёўку, асабліва сярод студэнцкай моладзі, аказваецца ўсё больш.

Цяпер паміж абласной камісіяй па аздараўленню і універсітэцкай здраўніцай з дапамогай прафкома студэнтаў ГДУ заключаны дагавор аб аздараўленні. Згодна яго ў кожны заезд набіраецца 50 студэнтаў-першакурснікаў, якім не споўнілася 18-ці гадоў (бясплатна, па чарнобыльскаму фінансаванню), і 100 чалавек на платнай аснове, прычым, кожная 5-ая пуцёўка можа выдавацца студэнтам-старшакурснікам без аплаты. Кошт пуцёўкі для студэнта складае 70% ад сацыяльнай стапендыі -- 280 тыс.руб.

Выкладчыкі і супрацоўнікі плацяць за харчаванне і лячэнне 420 тыс.руб., кошт курсоўкі -- 140 тыс.руб.

Калі параўнаць цэны на прадукты харчавання ў магазінах, на лекавыя прэпараты ў аптэках, становіцца відавочным: для асабістага бюджэту выгадна набываць пуцёўку ў наш санаторый-прафілакторый.

Мы любім тэатр

# ЧАЛАВЕК-ЗАГАДКА?..



Студэнты філалагічнага факультэта паглядзелі ў абласным драматычным тэатры камедыю "Карнавал Параклета" у пастаноўцы лаўрэата прэміі імя Л.Мазалеўскай, заслужанага .дзеяча мастацтваў рэспублікі рэжысёра Уладзіміра Караткевіча. Нас зацікавіў непаўторны і арыгінальны сюжэт спектакля. Гэта -- вельмі смешная, але часам і з сумнымі момантамі гісторыя.

Галоўны герой Параклет, ролю якога выканаў заслужаны артыст рэспублікі Віктар Чэпелеў, змог фантастычна лёгка і проста ашукаць трох жанчын: даму з сабачкам (артыстка Надзея Бяляева), глуханямую (арт. Яўгенія Канькова) і распутніцу (арт. Наталля Дзярэбіна). Ён удала маскіруецца пад цыганку, потым мы бачым яго сур'ёзным панам у капелюшы і касцюме, затым -- гэта нейкі Карл Іванавіч Шмідт...

На мой погляд, роля Параклета -- самая складаная ў гэтай камедыі, таму што тут трэба разумець псіхалогію чалавека, асабліва жаночую, і яшчэ мець талент весці людзей за сабой. Калі б мяне спыталі: "На каго больш падобны па звычаях і характары гэты чалавек?", то я б адказаў: "На галоўнага героя славутага твора "Залатое цялё" Астапа Бэндэра. Параклет, як і Астап, меў нейкую чароўную асаблівасць падпарадкоўваць сабе людзей, знаходзіць любыя сродкі для таго, каб дасягнуць той або іншай мэты. У той жа час гэта вясёлы, з добрым пачуццём гумару чалавек.

Камедыя глядзіцца лёгка і з цікавасцю. Асаблівае ўражанне сваёй ігрой зрабіў Віктар Чэпелеў. Не памылюся, калі скажу, што гэтая роля быццам напісана для яго, гэта -- ягоны вобраз. Тонкі і халодны разлік, цэнтрычны псіхалагізм -- вось галоўныя якасці, якія трэба было абыграць і адчуць акцёру. І з гэтай нялёгкай задачай В.Чэпелеў справіўся вельмі паспяхова. Іншыя артысты таксама стварылі яркія і запамінальныя вобразы: Ліда (арт. Святлана Гаркуша), студэнт (арт. Павел Харланчук), акцёр Светазараў (арт. Сяргей Лагуценка) і яго жонка, таксама актрыса (арт. Вольга Хайкова).

Я лічу, што спектакль атрымаўся выдатным, дзякуючы вельмі добрай гульні занятых у ім акцёраў, простаму і арыгінальнаму (паўтаруся яшчэ раз) сюжэту. Спектакль нясе ў сабе цеплыню, дабро і святло. Нездарма ў прадмове да п'есы сказана, што гэтая п'еса паказвае нам не толькі ўсю глыбіню чалавечых пачуццяў, але і дае нам магчымасць убачыць грань паміж прыгожым і агідным.

**Ігар БАДУНОЎ,**
**студэнт гр. БА-13 філалагічнага факультэта.**

*В редакционной почте — поэзия*

**Иван ХАРЛАМОВ**

x x x

В живом родстве с людьми
Я рос,
К судьбе терпимый...
Понятья "я" и "мы"
Во мне -- неразделимы.

Крепчал единства круг,
И всюду -- без изъятья --
Был каждый
Другу друг,
И жили мы, как братья.

В раздолье тишины
Врывалось эхо строек.
Могучий дух страны
Рождал
Везде героев.

Корыстия контраст
Сникал,
Терпя утраты...
И не было у нас
Ни нищих,
Ни богатых.

Шлях к правде --
Чист и свеж, --
Хотя и был не краток,
Но, словно дар
Надежд,
К нам приходил
Достаток.

Средь суеты и дел
Влек отдых нас
В просторы.
И каждый,
Кто хотел,
Мог поплескаться
В море...

Прочнела
Веры нить.
Душа покой
Хранила.
... Так можно ли хулить
Все то,
Что у нас было?

**В ГОСПИТАЛЕ**

Щемят застарелые раны,
Ссутулили годы
И труд.
Последний рубеж
Ветераны
С упорством
У жизни берут...

Мягка
Госпитальная койка.
Вершат исцеленье
Врачи.
И все ж на душе
Что-то горько,
Растерянно
Сердце стучит.

Саднят
Безысходность печали,
Ушедших надежд миражи...
Страна,
Что они отстояли,
В разрухе и смуте
Лежит.

Сходясь,
Чертыхаются дружно,
И ругань сорвется порой...
И клюшки гремят,
Как оружье,
Когда-то их влекшее
В бой.

*Поэтический дебют*

**Елена КАЦУРА, студентка гр.РБ–13 филологического факультета.**

x x x

*В сиреневой дымке растаяла ночь,*
*И утро в заветное кресло садится.*
*Приходит рассвет, и скрываются прочь*
*Тревожные мысли и странные лица.*
*Обиды вулкан затихает к утру,*
*И горькая лава сомнений твердеет.*
*Лишь легкий туман в опустевшем бору*
*По-прежнему чувством страдания веет.*
*Уходят с рассветом в туманную даль*
*Печальные образы с ликом неверий,*
*И утро с лица поднимает вуаль,*
*И в миг открываются в новый день двери.*

**С НОВЫМ ДНЕМ!**

*Кто тебя утешит,*
*Кто тебя поймет,*
*Кто тебя услышит,*
*Кто же позовет?*
*Только утром солнце*
*Жизнь тебе вернет.*
*Нежно, сквозь оконце*
*"С новым днем!" споет.*
*Прогони сомненья,*
*И печаль уйдет.*
*Новое движенье*
*Утро принесет.*
*День откроет двери*
*В новую зарю.*
*Место вечной веры*
*В завтрашнем краю.*





Творчая справаздача пісьменніка

# ЛЕСВІЦА ДА ВЯРШЫНІ

...Для кожнага чалавека надыходзіць аднойчы той дзень, калі ён, азіраючыся на мінулае, узгадвае пражытыя гады, усе цяжкія хвіліны і радасныя імгненні, нявыпраўленыя памылкі і ажыццёўленыя мары, намагаецца падвесці пэўныя вынікі прамільгнуўшаму адрэзку ўласнага існавання, убачыць, нарэшце, тое, да чаго ён заўсёды імкнуўся, што стварaў сваімі рукамі на працягу ўсіх гэтых гадоў, асэнсаваць, дзеля чаго ён нарадзіўся на Зямлі...

Асабліва важная такая хвіліна для асобы, бо ў гэты дзень чалавек трымае сапраўдную справаздачу не толькі перад іншымі людзьмі, роднымі і блізкімі, прыхільнікамі або праціўнікамі, але і перад Богам, які падараваў яму талент, даючы незвычайную магчымасць абессмяроціць сябе, аддаць жыццё не толькі ўласнай сям'і і сябрам, але і радзіме, народу і, можа быць, усяму чалавецтву. Далёка не кожны атрымлівае такую магчымасць, разам з якой ускладаюцца на плечы абранніка нялёгкія абавязкі, выканаць якія ён проста павінен...

Менавіта на такую творчую справаздачу сабраў гасцей наш зямляк, таленавіты пісьменнік Васіль Юр'евіч Ткачоў, які нядаўна адзначыў сваё 50-годдзе. Павіншаваць з юбілеем майстра роднага слова прыйшлі ў святочную залу абласнога драматычнага тэатра ягоныя родзічы і сябры, землякі, пісьменнікі, афіцыйныя асобы вобласці, чытачы і прыхільнікі таленту драматурга, празаіка і публіцыста.

Цёплыя віншаванні і найлепшыя пажаданні прагучалі ў адрас юбіляра, кіраўніка пісьменніцкай арганізацыі Гомельшчыны, ад старшыні абласнога Савета дэпутатаў В.С.Сяліцкага, намесніка старшыні аблвыканкома А.М.Ярчака, начальніка абласнога ўпраўлення культуры А.Р.Маісеенкі, загадчыцы аддзела культуры Гомельскага гарвыканкома Л.К.Сайковай, землякоў з Рагачоўшчыны, Быхаўшчыны, рэжысёраў, паэтаў і празаікаў, якія адзначылі велізарны ўклад В.Ю.Ткачова ў развіццё беларускай літаратуры.

Але спачатку пад кіраўніцтвам вядучага вечара У.Караткевіча, галоўнага рэжысёра абласнога драматычнага тэатра, пісьменнік пачуў першыя пажаданні ад герояў сваіх п'ес і гумарыстычных твораў, якія быццым бы сабраліся ў роднай хаце драматурга, якой на гэты дзень стала вясковая хата са спектакля "Усміхаўся месяц белай вішні". Радасцю і шчасцем гарэлі вочы юбіляра, калі на сцэне зноў ажывалі прыдуманыя ім персанажы, з вуснаў якіх гучалі жыццёвыя прынцыпы і перакананні аўтара. Ягоныя перажыванні і трывогі, надзеі і спадзяванні перадаваліся ўсім гасцям. Прысутнічалі на ўрачыстай вечарыне і самыя дарагія для пісьменніка людзі -- маці і бацька Васіля Ткачова, якія заўсёды дапамагалі і падтрымлівалі сына ва ўсіх яго пачынаннях.

Віншавалі юбіляра і акцёры абласнога драматычнага тэатра, якія паказалі ўрывак з п'есы "Усміхаўся месяц белай вішні", чыталі гумарыстычныя творы пісьменніка. Убачылі гледачы і частку спектакля "Шкірдзюкі займаюць абарону" у выкананні артыстаў тэатра-студыі "Если бы..." студэнцкага культурнага цэнтра нашага універсітэта, бо менавіта гэтая пастаноўка дапамагла студэнцкаму тэатру прэтэндаваць на атрыманне звання народнага. Прыехалі на свята Васіля Ткачова і землякі з Рагачоўскага народнага тэатра, якія, паказаўшы ўрывак з п'есы "Лесвіца", прымусілі юбіляра ўзняцца на сапраўдную лесвіцу, што сімвалізавала вяршыню жыцця і творчасці аўтара.

Гучала шмат добрых і шчырых слоў, і Васіль Юр'евіч атрымаў вялікую колькасць самых розных падарункаў. Але найбольш цікавым і запамінальным з іх было ўручанае пісьменніку вялікае драўлянае пяро, памеры якога суадносяцца з талентам драматурга.

І сапраўды, дзякуючы ўласнаму пісьменніцкаму стылю, непаўторнай манеры, якая спалучае ў сабе сур'ёзнасць праблематыкі і невычэрпную гумарыстычнасць герояў, Васіль Ткачоў па праву займае сваё пачэснае месца сярод іншых беларускіх пісьменнікаў.

*Дык пажадаем жа юбіляру здароўя і даўгалецця, ажыццяўлення ўсіх творчых планаў і натхнення!*

**С.КАГАН,**
**студэнтка гр.БА-23**
**філалагічнага факультэта.**



**Цеснае творчае сяброўства звязвае пісьменніка і драматурга Васіля Ткачова з самадзейным студэнцкім тэатрам-студыяй "Если бы..." нашага універсітэта. Менавіта гэты калектыў удала ажыццявіў пастаноўку яго п'есы "Шкірдзюкі займаюць абарону", што дало яму права прэтэндаваць на прысуджэнне звання народнага.**

*На здымку:* сцэна са спектакля.

**Фота У.ЧЫСЦІКА.**

☺☺☺☺☺ *Усміхніцеся* **СА СТУДЭНЦКАГА ГУМАРУ** ☺☺☺☺☺

***Экзамены***

•Студэнт не павінен губляць надзею, пакуль экзаменатар не страціў самавалодання.

•••

•Хочаш атрымаць разумны адказ -- пытай разумна!

•••

•Экзамены палохаюць кожнага, нават самага падрыхтаванага чалавека, таму што самы вялікі дурань можа спытаць больш, чым самы разумны адказаць.

•••

•-- Я ўжо падумваю, а ці не гіпнатызёр я? Як толькі пачынаю чытаць лекцыю, уся аўдыторыя тут жа засынае.

•••

•Амаль у кожнай казцы цар задае Іванушцы тры самыя закавырыстыя пытанні. Відавочна, па гэтай старажытнарускай эпічнай традыцыі, экзаменуючымся прапаноўваюць заўсёды адказаць на тры пытанні.

•••

Педагог пытае ў студэнта:
-- Скажыце, Пятроў, хто быў бацькам Людовіка Шаснаццатага?
-- Людовік Пятнаццаты.
-- Так. А хто быў бацькам Карла Сёмага?
-- (радасна) Карл Шосты!
-- Цудоўна. Ну, а скажыце нам, хто быў бацькам Францыска Першага?
--?!

•••

•-- Які народ мінулага вам больш за ўсё падабаецца? -- спытаў выкладчык студэнта.
-- Фінікіяне.
-- Чаму?
-- Таму што ў падручніку аб іх гаворыцца менш, чым аб іншых.

•••

•Прафесар пытае ў студэнта:
-- Якая важная падзея адбылася пасля смерці цара Сімеона?
-- Яго пахавалі.

•••

•-- Якая знамянальная падзея адбылася ў 1769 годзе? -- спытаў экзаменатар у студэнта.
-- Нарадзіўся Напалеон.
-- А ў 1776 годзе?
-- Напалеону споўнілася сем гадоў.
-- А ў якім годзе памёр Напалеон?
-- Але я нават не ведаў, што ён хварэў.

•••

•-- На жаль, пан рэктар, я не здолею заплаціць за навучанне ў гэтым годзе.
-- Тое ж самае вы казалі і ў мінулым годзе!
-- І заўважце, -- сваё слова я стрымаў!

•••

•-- Якая розніца паміж маланкай і электрычнасцю?
-- За маланку не плацяць.

•••

•-- Скажыце, Іванова, вы б маглі даказаць, што вада прыцягвае электрычнасць?
-- Так! Кожны раз, як толькі я прымаю ванну, звоніць тэлефон.

•••

•На практычных занятках студэнт расказвае аб адкрыцці Архімеда:
-- ... І тады Архімед выскачыў з басейна і ўсклікнуў: "Эўрыка!"
-- А што такое "эўрыка"? -- пытаецца выкладчык.
-- "Эўрыка" значыць "знайшоў".
-- Добра. А зараз скажыце нам, што знайшоў Архімед у басейне?
-- Эўрыка! Ён знайшоў мыла!

Да вынікаў спартыўнага года

## СТУДЭНТЫ -- СЯРОД МАЦНЕЙШЫХ, ТРЭНЕРЫ -- ПА-ЗА ДЗЕСЯТКАЙ

Па традыцыі было праведзена апытанне трэнераў, спецыялістаў, аматараў спорту для вызначэння лепшых спартсменаў Гомельшчыны за 1997 год. Быў названы і лідэр года. Ім стаў студэнт завочнага аддзялення факультэта фізічнай культуры нашага універсітэта майстар спорту міжнароднага класа па веславанню на байдарках і каноэ, чэмпіён свету, выхаванец Светлагорскай ДЮСШ "Хімік" Уладзімір Мерынаў. Другую суму галасоў набраў таксама студэнт-завочнік названага факультэта ГДУ майстар спорту міжнароднага класа па дзюдо, чэмпіён Еўропы, выхаванец спартыўнага клуба "Гомсельмаш" Рашад Мамедаў.

Студэнт IV курса факультэта фізічнай культуры майстар спорту міжнароднага класа па скачках на батуце, сярэбраны прызёр чэмпіянату Еўропы Руслан Кашперка заняў 6-ае месца ў кагорце мацнейшых.

Сярод лепшых спартсменаў вобласці за мінулы год таксама выпускнікі ГДУ майстар спорту міжнароднага класа па скачках на батуце, сярэбраны прызёр чэмпіянату Еўропы, бронзавы прызёр фінала Кубка свету Наталля Карпенкава, заслужаны майстар спорту па сучаснаму пяцібор'ю, сярэбраны прызёр фінала Кубка свету Жана Шубянок, заслужаны майстар спорту па вольнай барацьбе Сяргей Смаль, заслужаны майстар спорту па лёгкай атлетыцы фіналістка чэмпіянату свету па лёгкаатлетычнаму сямібор'ю Наталля Сазановіч, заслужаны майстар спорту па акадэмічнаму веславанню, фіналістка чэмпіянату свету Наталля Стасюк, майстар спорту міжнароднага класа па акадэмічнаму веславанню Галіна Аўдзейчук.

Адначасова з мацнейшымі спартсменамі былі вызначаны і 10 лепшых трэнераў. На жаль, сярод іх не аказалася ніводнага прадстаўніка нашага універсітэта.



ЗІМОВЫ ПАРК. Фота У.Чысціка

**ГОМЕЛЬСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ імя Ф.СКАРЫНЫ**

аб'яўляе конкурс на замяшчэнне вакантных пасад па кафедры:
-- філасофіі -- ст.выкладчыка.

Тэрмін падачы заяў -- не пазней 1 месяца з дня апублікавання паведамлення.

Заявы накіроўваць на адрас: 246699, г.Гомель, вул.Савецкая, 104.

**РЭКТАРАТ.**

Рэктарат, дэканат, калектыў матэматычнага факультэта, Савет ветэранаў вайны і працы універсітэта смуткуюць з выпадку смерці былога дацэнта кафедры матаналізу **ФРЫДМАНА Генрыха Аронавіча** і выказваюць спачуванне яго сям'і і родным.

Аўтары надрукаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытат, эканамічных даных, асабістых імён, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, каб у матэрыялах не ўтрымлівалася даных, якія не падлягаюць адкрытай публікацыі. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не раздзяляючы пункту гледжання аўтара.

ЗАСНАВАЛЬНІК -- Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф.Скарыны.

Наш адрас: 246699, г. Гомель, вул. Савецкая, 104, пакой 1-18, тэл. 57-43-21.
Рэгістрацыйны № 263

Спонсар газеты -- прафком студэнтаў.

Газета набрана і зверстана на настольна-выдавецкім комплексе ІВЦ ГДУ, аддрукавана на фабрыцы "Паліграфдрук", г.Гомель, вул. Савецкая, 1.

Рэдактар Ул.П. БАЛОГА

Аб'ём 1 друк. арк.
Тыраж 1.000 экз.
Заказ 56.
Падпісана да друку 6.02.98.